

ГУМАР І ЖАРТЫ АД КОЛАСА І КУПАЛЫ **6**



СТОЛІН ВІТАЕ «ВЫТОКІ» **6**

7 ЧЭРВЕНЯ 2022 г.
АЎТОРАК
№ 109 (29731)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 першых вуснаў

# «ПРАЎДА НА НАШЫМ БАКУ, МЫ ВЫТРЫМАЕМ ЛЮБЫ ЦІСК»

### Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам



Фота БелТА.

**Візіт на беларускую зямлю Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла Аляксандр Лукашэнка назваў асаблівым знакам яднання і згуртаванасці народаў у складаныя часы. «Увогуле, няпросты час... І добра, што вы прыехалі на сваю зямлю. Для нашага народа гэта добры знак — знак яднання і згуртаванасці перад злымі сіламі, як наш уладыка кажа. Але, паверце, праўда на нашым баку. Яна заўсёды мацнейшая, і мы вытрымаем любы ціск на нас, які б ён ні быў: у форме мяцяжу, гібрыдных войнаў ці гарачых. Мы вытрымаем. Без нас, без нашай цывілізацыі не можа быць планеты. Дзякуй вам за гэты добры знак. Ведайце, што вы тут заўсёды не як дома, а дома, на сваёй зямлі», — заявіў Прэзідэнт Беларусі на сустрэчы.**

«Перадусім рады бачыць вас у добрым здароўі, бадзёрым настроі, — сказаў на сустрэчы Аляксандр Лукашэнка. — Я добра паглыблены ва ўсе гэтыя мерапрыемствы, рыхтаваліся ж загадзя. Вельмі прыемна было бачыць шэсце (хрэсны ход у Полацку. — **«Зв.»**). Шмат людзей прыйшло, нават з Варонежа прыязджалі, каб прайсціся і адсвяткаваць. Для нас гэта вельмі важна».

Кіраўнік краіны падзякаваў патрыярху, што ў святочны для праваслаўных беларусаў дзень ён прыбыў у нашу краіну, і запрасіў яго на святкаванне 900-годдзя Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку ў 2025 годзе.

«Думаю, што вы знойдзеце час яшчэ да нас прыехаць. У нас жа 900-годдзе манастыра ў 2025 годзе. Я вас з задавальненнем прыму ў Беларусі ў любы час. Я часта кажу, што гэта ваша зямля з часоў вашага служэння ў царкве ў Смаленску, калі вы ў Калінінград праз Беларусь прыляталі. Я памятаю ўсе вашы выказванні таго часу. Вы вельмі любілі Беларусь. Я памятаю нашу першую сустрэчу ў гарах Сочы. Тая размова да гэтага часу актуальная», — успомніў ранейшыя сустрэчы з уладыкам Прэзідэнт.

Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл падтрымаў словы Аляксандра Лукашэнкі і пацвердзіў, што ў Беларусі адчувае сябе, сапраўды, як сярод сваіх людзей.

«Калі ідзеш да нейкага кіраўніка краіны, розныя думкі ў галаве: як будзе. А тут я з лёгкім сэрцам, бо ведаю, што іду да блізкага чалавека, які прыняў на сябе вялікую адказнасць за бяспеку і захаванне свайго народа, захаванне яго самабытнасці», — падкрэсліў прадстаяцель Рускай праваслаўнай царквы.

Па яго словах, ва ўмовах глабалізацыі барацьба за самабытнасць з'яўляецца барацьбой за выжыванне нацыі. «Магчыма, не ў фізічным сэнсе, а ў духоўным і культурным. Гора будзе роду чалавечаму, калі ўсіх памераюць на адзін капыл, калі людзі будуць кіравацца стандартамі, выпрацаванымі ў нейкіх цэнтрах па-за іх удзелам, і пад гэтыя стандарты будуць падроблівацца і палітыка, і культура, і жыццё людзей. Таму сёння суверэнітэт — гэта больш чым палітычны суверэнітэт — гэта свабода людзей. Рады сведчыць, што Беларусь адносіцца да тых дзяржаў, пра якія можна казаць як пра суверэнную дзяржаву», — канстатаваў патрыярх.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

**Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл** расказаў журналістам, якія асноўныя пытанні абмеркаваў на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам.

«Размова была працяглай і вельмі змястоўнай. Я выдзеліў бы два кампаненты гэтай размовы. Першы, меў дастаткова нечаканы характар, — светапоглядны. Мы імкнуліся разам адказаць на шэраг пытанняў, якія звязаны з вельмі складанай і не ўсім зразумелай праблемай — выжыванне чалавечай цывілізацыі. Куды ідзе свет? Што адбываецца з людзьмі, з чалавечай цывілізацыяй? І размова ідзе не толькі пра выклікі, звязаныя з тэмай вайны і міру, канфліктаў, але і пра экалогію ў шырокім сэнсе слова», — сказаў патрыярх.

Па яго словах, чалавек перастае быць чалавекам, калі страчвае маральныя арыенціры, і задача цёмных сіл у тым, каб чалавек не мог адрозніць дабро ад зла.

«Калі гэта адбываецца, чалавек становіцца кіруемым і развіццё цывілізацыі яму непадуладнае. Таму што там, дзе зло, — там смерць, знішчэнне. А дзе дабро — там жыццё. У двух словах я вам перадаў змест філасофскай размовы. Але яна вельмі важная, бо ў ёй удзельнічаў і патрыярх, і кіраўнік краіны», — дадаў уладыка.

Ён адзначыў аднадумства, якое было ў суразмоўцаў, і з радасцю падкрэсліў, што Прэзідэнт занепакоены такімі глабальнымі тэмамі.

«Калі ў чалавека ёсць хваляванне пра такія глабальныя тэмы, то, у першую чаргу, ён факусіруе яго на асабістым парадку дня, звязаным з дабрабытам беларускага народа, вырашэннем задач, што стаяць перад Прэзідэнтам, урадам, усім беларускім народам», — канстатаваў патрыярх.

Ён дадаў, што падчас размовы не абышлі і тэму месца Беларусі ў сучаснай архітэктуры Еўропы.

Гарадское асяроддзе

# ПРЫГАЖОСЦЬ, ШТО РАТУЕ НАСТРОЙ

### Фестываль-конкурс ландшафтнага мастацтва ў Брэсце стаў генератарам новых ідэй і падыходаў у справе добраўпарадкавання і азелянення



**Маштабны фестываль ландшафтнага мастацтва «Горад-сад» завяршыў сваю работу ў Брэсце. Мэр горада Аляксандр Рагачук пры адкрыцці зазначыў, што падчас фэсту закладзена традыцыя правядзення новага значнага мерапрыемства, якое дазволіць зрабіць горад яшчэ больш прыгожым. «У Год гістарычнай памяці варта згадаць, што канцэпцыю горада-саду сто гадоў таму агучыў архітэктар Юльян Лісецкі», — нагадаў кіраўнік горада. Тады ж, дарэчы, быў створаны Гарадскі сад, які брастаўчане нядаўна аднавілі.**

СТАР. 3

# Пад купалам веры і вернасці





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У сталічным праваслаўным прыходзе храма Богаяўлення, які месціцца ў мікрараёне Лошыца, дзявяты год узводзіцца вялікая цагляная царква. Цяпер будаўнікі шчыруюць над купальнай часткай храма. Наогул, будаўніцтва архітэктурнага ансамбля пачалося ў 2011 годзе, ужо дзейнічае званіца. Па праекце ў храмавы комплекс таксама ўвойдзе асобная царква святых мурамскіх цудатворцаў Пятра і Фяўроніі, заступнікаў сямейнага шчасця, кахання і вернасці.**

Зварот у рэдакцыю

# «ВЫСКАЧЫЛА НА ВУЛІЦУ Ў АДНЫМ ХАЛАЦЕ ДЫ ТАПАЧКАХ»

### Згарэў дом: дзе шукаць падтрымку і дапамогу?

**Як кажуць, пажар горш за злодзея: злодзей хоць бы сцены пакіне, пажар забярэ ўсё. На пачатку красавіка бяда напаткала Людмілу Пашаеву са Стоўбцаў. «У мяне згарэў дом, — піша ў рэдакцыю жанчына. — Дакладней, сцены засталіся (ён шлакабетонны), а ўсё астатняе, што было ўнутры, згарэла. Падлога, столь, бытавая тэхніка, посуд, адзенне... Пенсія ў мяне невялікая, а самой хутка 70 гадоў. Жыць няма дзе. А калі ёсць, то трэба плаціць, а грошай няма... Хачу праз вашу газету звярнуцца да добрых людзей: дапамажыце, хто чым можа».**

#### «ПРАЧНУЛАСЯ АД ПАХУ ДЫМУ»

І вось я ў Стоўбцах. З Людмілай Паўлаўнай і яе 41-гадовай дачкой Сняжанай сустракаемся на вуліцы Першамайскай. Як аказалася, дом № 81, у якім жыла сталая жанчына, — на двух гаспадароў. Суседнюю кватэру, на шчасце, агонь не закрануў. У кватэру ж Людмілы Пашаевай без слёз заходзіць немагчыма: унутры чорныя ад сажы сцены, рэшткі абгарэлай мэблі, посуду...

СТАР. 5

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Брытанскія кансерватары ініцыіравалі вотум даверу Барысу Джонсану



Парламентарыі запусцілі працэдуру выказвання недаверу прэм'ер-міністру Злучанага Каралеўства Барысу Джонсану ў сувязі са скандалам з яго ўдзелам у вечарынках на Даўнінг-стрыт у перыяд лакдаўну з-за COVID-19, паведаміла Sky News. Патрабаванне правесці галасаванне паступіла ад неабходнага мінімуму аднапартыйцаў кіраўніка кабінета. Паводле даных The Sunday Times, ініцыятыву падтрымалі ўжо 67 парламентарыяў. З ліпеня мінулага года Барыс Джонсан застаецца адным з самых непапулярных членаў Кансерватыўнай партыі: паводле апытанняў сацыялагічнай службы YouGov, яго дзейнасцю на пасадзе прэм'ера незадаволены 68 працэнтаў рэспандэнтаў (максімум у 73 працэнты адзначаўся ў студзені), аднак у сярэднім непрыманне дзейнасці кіраўніка кабінета толькі павялічваецца. Гэта адбываецца на фоне глабальнага крызісу і росту інфляцыі, якая дасягнула 40-гадовага максімуму ў дзевяць працэнтаў, і, як прагназуе Банк Англіі, гэта яшчэ не мяжа. Сацыялагічная служба Ipsos паведамляе, што кожны трэці апытаны брытанец скараціў рацыён харчавання.

### Кошт нафты перавысіў $120 за бараль

Нафта падаражэла на фоне больш істотнага, чым чакалася, павышэння цэн для азіяцкіх пакупнікоў саудаўскай дзяржкампаніяй Saudi Aramco. Рынак успрыняў гэтае рашэнне як сігнал упэўненасці Саудаўскай Аравіі ў росце попыту на нафту, адзначае Bloomberg. Saudi Aramco паведаміла 5 чэрвеня, што падыме цэны ў ліпені на ўсе сарты нафты, што экспартуецца, для краін Азіі, Паўночна-Заходняй Еўропы і Міжземнамор'я. Цэны на нафту, якая экспартуецца ў ЗША, у наступным месяцы застануцца на ўзроўні чэрвеня. Цана асноўнага сорту Arab Light, які пастаўляецца ў Азію, павялічыцца на $2,1 за бараль. У выніку ён будзе каштаваць на $6,5 за бараль больш, чым кошык нафты Амана і Дубая. «Сезон пікавага попыту на энергарэсурсы ўжо наступіў», — адзначыў аналітык Cinda Securities Co ў Шанхаі Чэнь Шусянь.



### У Японіі каля 1,1 мільёна дамоў наступнай зімой могуць застацца без электраэнергіі



Японія ў выпадку халоднай будучай зімы можа сутыкнуцца з адным з найцяжэйшых за ўсю гісторыю краіны энергетычных крызісаў, паведаміла ТАСС са спасылкай на газету Nikkei. Паводле звестак выдання, прагназаваны энергакрызіс стане самым маштабным пасля землятрусу і цунамі ў 2011 годзе.

Адзначаецца, што ў Японіі была прыпынена работа некаторых цеплавых электрастанцый, працэс жа перазапуску АЭС адбываецца даволі маруднымі тэмпамі. Востра паўстае пытанне наконт далейшых закупак энергарэсурсаў у Расіі на фоне канфлікту ва Украіне. У сувязі з прагназаваным дэфіцытам электраэнергіі японскія ўлады плануюць правесці спецыяльнае пасяджэнне, на якім абмяркуюць меры, што неабходна прыняць, каб мінімізаваць наступствы крызісу зімой. «Неабходна сэканоміць як мага больш электрычнасці гэтым летам і падрыхтавацца да зімы, калі суадносіны попыту і прапановы электраэнергіі будуць яшчэ больш жорсткія», — заявіў генеральны сакратар Кабінета міністраў Японіі Хіракадзу Мацуна.

ISSN 1990 - 763X
22109>

### КОРАТКА

• **Купацца можна: санэпідслужба абследавала ўсе дазволеныя месцы адпачынку каля вады.**

• Уступныя іспыты ў ліцэі Беларусі пройдуць з 16 да 29 чэрвеня.

• **Беларуская дэлегацыя прымае ўдзел у 58-м кангрэсе Міжнароднага саюза канькабежцаў.**

• Прамысловы турызм, квэсты і сафары: у Віцебскай вобласці стартаваў праект «Вандруй. Адчуй. Натхняйся».

• **Гомельская міліцыя пачала выкарыстоўваць веласіпеды для схаванага кантролю за правапарадкам.**

• У Беларусі стартавала акцыя МНС «Вакацыі без дыму і агню».

Ёсць пытанне!

# ЛЕЦІШЧА: КУПІЦЬ АБО АРАНДАВАЦЬ НА СЕЗОН?

**У маім дачным чаце за апошні час з'явілася тры аб'явы аб тым, што людзі хочуць зняць лецішча на сезон, і адна аб тым, што хочуць купіць, можна ў дрэнным стане. З гэтай прыватнай статыстыкі зразумела, што набірае папулярнасць арэнда.**



#### Цікавасць да змены месцаў

«Шмат гадоў нам здавалася, што лецішча не патрэбна: бацькі родам з вёскі і заўсёды разам з намі маглі прыехаць да сваіх продкаў. Аднак старыя паміраюць, а іх дзеці-ўнукі, якія стала жылі ў вёсцы, гасцям з горада ўжо не рады. Сваякі таты ў такой сітуацыі выплацілі яму кампенсацыю, а вось матуліны паводзілі сябе вельмі агрэсіўна: маўляў, забудзься пра сваю долю спадчыны. Яна і забылася, — расказвае 37-гадовы Сяргей. — У 2020 годзе з-за каранавіруса прыйшлося адпачываць дома. Вырашылі арандаваць лецішча.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Форум

# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ «ЛІЧБЫ»

## Учора ў Мінску стартаваў міжнародны форум ТІБО-2022

**Форум ТІБО — унікальная пляцоўка для абмену перадавым вопытам у сферы інфармацыйных тэхналогій, аналізу найлепшых сусветных практык лічбавай трансфармацыі і абмеркавання перспектыў эфектыўнага выкарыстання найноўшых тэхналагічных трэндаў у традыцыйных галінах эканомікі. На працягу пяці дзён дзяржаўныя арганізацыі і прыватныя кампаніі будуць прадстаўляць свае распрацоўкі і тэхналогіі на пляцоўцы «Мінск-Арэны».**

Прывітанне ўдзельнікам і гасцям форуму накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Свет уступіў у новую эпоху, і Беларусь па праве ўваходзіць у лік краін, якія найбольш актыўна ўкараняюць працэсы лічбавізацыі ў эканоміцы, дзяржаўным кіраванні, фінансавай і сацыяльнай сферах», — гаворыцца ў прывітанні.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што пляцоўка форуму ўжо шмат гадоў дае цудоўную магчымасць для абмеркавання новых падыходаў да кіравання лічбавым развіццём, шырокай прэзентацыі ўжо дасягнутых вынікаў, абмеркавання перспектыў будучых пераўтварэнняў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што актыўны ўдзел у «ТІБО-2022» прадстаўнікоў Еўразійскай эканамічнай камісіі, дзяржаў — членаў ЕАЭС і СНД дае магчымасць спецыялістам і экспертам міжнароднага ўзроўню абменьвацца перадавым вопытам, прасоўваць самыя крэатыўныя ідэі, заключаць выгадныя кантракты.

«Перакананы, што цяперашняя сустрэча ў Мінску будзе яркай і плённай для прафесіяналаў IT-індустрыі і шматлікіх гасцей», — падкрэсліў беларускі лідар.

*Наш карэспандэнт працуе на форуме, і пра самыя цікавыя моманты «лічбавага» мерапрыемства «Звязда» раскажа ў найбліжэйшых нумарах.*

# «Я ЎСТУПІЎ НА ВЕЛЬМІ ДОБРАЗЫЧЛІВУЮ І ДУХОЎНА МОЦНУЮ ЗЯМЛЮ»

**Трохдзённы візіт кіраўніка Рускай Праваслаўнай Царквы Святейшага Патрыярха Кірыла ў межы Беларускага экзархата прымеркаваны да святкавання 1030-годдзя праваслаўя на беларускіх землях і ўтварэння Полацкай епархіі.**



— Пачуцці вельмі станоўчыя, таму што гэта мой першы візіт пасля таго, як пачалася гэтая напасць з ковідам. Выдатнае надвор'е і дзівосныя беларускія краявіды ствараюць павышаны эмацыянальны фон, — сказаў патрыярх Кірыл адразу пасля прыбыцця. — Кожны раз з асаблівым пачуццём уступаю на беларускую зямлю. Нельга не ўспомніць вялікі подзвіг народа на гэтай зямлі, які твар у твар сутыкнуўся са страшнай агрэсіяй. І нельга не ўспомніць ахвяры, якія панёс беларускі народ. Таму першым крокам, які я зраблю, будзе ўскладанне вянка ў памяць аб тых ахвярах, да якіх мы ставімся з вялікай удзячнасцю.

Для мяне важна тое, што я ўступіў на вельмі добразычлівую, адкрытую, прыгожую і духоўна моцную зямлю, таму заклікаю блаславенне Божае на беларускі народ і зямлю, каб Гасподзь захоўваў усіх вас ад усякага зла і спрыяў духоўнаму і эканамічнаму развіццю на карысць народа, — дадаў ён.

У ходзе візіту Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі ўзначаліў утраню ўсяночнага трывання ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска і правёў асвяшчэнне храма, а 5 чэрвеня, у дзень памяці прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай, здзейсніў літургію ў







саборы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра.

Адразу пасля прылёту патрыярх Кірыл прыняў удзел у цырымоніі ўскладання вянка да манумента Перамогі. А таксама ўсклаў кветкі да помніка першаму Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі мітрапаліту Філарэту.

— Мы рады, што вы знайшлі магчымасць падзяліць урачыстасці, якія святкуюцца ў гэтыя дні, наведваеце беларускія землі. 1030-годдзе Полацкай епархіі — знамянальная для нас дата, — сказаў, вітаючы патрыярха Кірыла на беларускай зямлі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Адзначым, што гэта першы візіт патрыярха ў Беларусь за апошнія чатыры гады. Як сказаў журналістам Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак, патрыярх Кірыл лёгка адгукнуўся на прапанову наведаць Беларусь.

— Адыграла ролю і тое, што мы разам адолелі пандэмію. Яго візіт сімвалізуе сёння адраджэнне спакойнага жыцця, калі можам спакойна рухацца наперад, гадаваць дзяцей, — адзначыў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

А ўвечары 4 чэрвеня сотні вернікаў прыйшлі да Свята-Духава кафедральнага сабора Мінска. Для тых, хто не змог трапіць унутр сабора, вялася трансляцыя службы на экран, усталяваны каля храма. Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл правёў вячэрняе богаслужэнне. Таксама ўрачыстую службу ў Кафедральным саборы вялі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, і кіраўнік спраў Маскоўскай Патрыярхіі, мітрапаліт Васкрасенскі Дыянісій.

— Сёння ў мяне была магчымасць пакланіцца манументу Перамогі ў Мінску, прынесці кветкі. Стоячы каля помніка, я задаў сабе пытанне: што азначае гэты вялікі подзвіг людзей, якія жыццё сваё аддалі за Радзіму, якія ў большасці невядомыя? Няўжо ён зараз не мае ніякага значэння, акрамя гістарычнага? Зусім не. Таму што прыклады тых, хто здольны жыццё сваё аддаць за Айчыну, з'яўляюцца наймацнейшай ілюстрацыяй таго, што азначае подзвіг. Без натхнення, перакананне не маглі яны з лёгкасцю аддаваць жыццё дзеля таго, каб хтосьці пасля іх жыў у міры і дабрабыце. Тое сапраўды быў і духоўны подзвіг. Дай Бог, каб мы, людзі, якія жывуць у мірны час, памяталі, што без гэтага руху ўверх і наперад не будзем паспяховыя ні ў гэтым жыцці, ні для Царства Божага, — падкрэсліў патрыярх Кірыл на ўтрані ўсяночнага трывання ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска.

У нядзелю, 5 чэрвеня, у дзень памяці прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай, Святейшы Патрыярх Кірыл здзейсніў літургію ў саборы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра Полацка. На ўрачыстым богаслужэнні прысутнічаў увесь беларускі епіскапат, а таксама члены Святога Сінода Рускай праваслаўнай царквы.

Утварэнне Полацкай епархіі стала важнай вяхой у гісторыі праваслаўя на беларускіх землях, і гэты горад па праве лічыцца вытокам праваслаўя ў Беларусі. Полацкая епіскапская кафедра, першая на беларускіх землях, была ўтворана ў 992 годзе. Да 1007 года адносіцца летапіснае згадванне аб першым праваслаўным полацкім храме — царкве Прасвятой Багародзіцы. А ў сярэдзіне XI стагоддзя ў Полацку быў узведзены чацвёрты ў хрысціянскім свеце Сафійскі сабор. І менавіта ў Полацку пачала свой зямны шлях прападобная Ефрасіння Полацкая, ігумення манастыра Святога Спаса, кананізаваная святая і нябесная заступніца беларускай зямлі.

— Сённяшняе свята — гэта новая слаўная старонка ў гісторыі нашай царквы і Беларускага экзархата, — сказаў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Ён таксама выказаў пажаданне і надзею, што візіт у Полацк і зносіны з паствай натхняць патрыярха Кірыла на новыя здзяйсненні на карысць царквы.

**Дзіяна РОНІНА. Фота БелТА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

# СПЕЦЫЯЛІСТ У КРОС-АДУКАЦЫІ. ХТО ТАКІ?

**Прыёмная кампанія ў магістратуру стартуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Сёлета прыём будзе весціся па 50 спецыяльнасцях, у рамках якіх вядзецца падрыхтоўка па 82 прафілізацыях. Распрацаваны 33 навучальныя планы на англійскай мове, у тым ліку дзесяць новых.**

Спецыяльнасці і прафілізацыі ў БДУ пастаянна актуалізуюцца. З 2022/2023 навучальнага года адкрыты набор на новую спецыяльнасць «Ядзерная і радыяцыйная бяспека» з прафілізацыяй «Радыяцыйная абарона і культура ядзернай бяспекі» на хімічным факультэце. На біялагічным факультэце падрыхтоўка магістрантаў будзе ажыццяўляцца па спецыяльнасці «Біяінфарматыка» з прафілізацыяй «Фундаментальная і прыкладная біяінфарматыка», на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі — па спецыяльнасці «Землеўпарадкаванне, кадастры, геадэзія і геаматыка» з прафілізацыяй «Геаматыка».

На факультэце міжнародных адносін падрыхтоўка магістрантаў пройдзе па новых прафілізацыях «Глабальныя трэнды сучаснага Кітая» і «Мытнае рэгуляванне ў міжнародных эканамічных адносінах», на факультэце філасофіі і сацыяльных навук — «Сацыяльнае праектаванне і кіраванне сацыяльнымі працэсамі», на эканамічным факультэце — «Міжнародная палітычная эканомія», на юрыдычным факультэце — «Дзяржаўнае кіраванне інфармацыйнай прасторай. Прававое рэгуляванне адносін у сетцы Інтэрнэт і абароны персанальных звестак», на кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі — «Крос-культурная адукацыя».

Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя ў 2022/2023 навучальным годзе адкрывае падрыхтоўку ў магістратуры па спецыяльнасці «Тэорыя і методыка навучання і выхавання (па абласцях і ўзроўнях адукацыі)» і прафілізацыі «Методыка выкладання кітайскай мовы ва ўстановах адукацыі».

Правілы прыёму асоб для атрымання вышэйшай адукацыі II ступені, парадак прыёму ў магістратуру БДУ на 2022 год, пералік спецыяльнасцяў, па якіх плануецца навучанне, размешчаны на афіцыйным сайце БДУ ў раздзеле «Адукацыя» — «Вышэйшая адукацыя» — «Магістратура».

Першым дакументы ў магістратуру пачынае прымаць Інстытут бізнесу БДУ — з 1 чэрвеня. На ўсе астатнія факультэты дакументы ад абітурыентаў прымаюць з 27 чэрвеня да 5 ліпеня.

Уступныя іспыты арганізуюць з 7 да 8 ліпеня, у Інстытуце бізнесу БДУ — з 25 да 30 жніўня (прыём дакументаў заканчваецца 24 жніўня).

Тэрміны навучання па спецыяльнасцях магістратуры ў вочнай (дзённай) форме вагаюцца ад года да двух гадоў. На вочнай (вячэрняй) і завочнай формах магістранты навучаюцца паўтара і два гады.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ДОБРЫ ІМПУЛЬС ДЛЯ АЙЧЫННАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ»

**Як заявіў намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК, замежныя партнёры Беларусі затрымліваюць пастаўкі медыцынскага абсталявання і запасных частак да яго. Але з уплывам санкцый трэба актыўна змагацца. І некаторыя задачы ўжо ўдалося вырашыць.**

— Нашы партнёры за мяжой затрымліваюць пастаўкі — даўжэйшымі сталі шляхі дастаўкі цяжкай тэхнікі. Раней гэта займала 60 дзён, цяпер — 90. У сакавіку былі праблемы па лагістыцы, цяпер яны вырашаны. Сёння колькасць тэхнікі, якая прастойвала, скарацілася. За гэты тыдзень трэба шмат чаго адрамантаваць. Спадзяёмся, станоўчая дынаміка захаваецца, — сказаў намеснік міністра.

Напрыклад, з 3 чэрвеня пачало работу адрамантаванае абсталяванне ў Мінскім анкадыспансеры.

— Альтэрнатыўныя шляхі паставак таксама шукаем, адпрацоўваем лагістыку, прыцягваем новых пастаўшчыкоў. Але і са старымі не разрываем кантакты. Былі запэўніванні, і, спадзяюся, яны застануцца ў сіле, пастаўкі не спыняцца. Наша насельніцтва будзе працягваць атрымліваць меддапамогу ў поўным аб'ёме.

Рэч у тым, што замена дэталяў высокатэхналагічнай тэхнікі — пытанне тонкае.

— Мы стараемся ставіць запчасткі арыгінала або выпушчаныя з ліцэнзіяй арыгінала, — адзначыў Барыс Андрасюк.

Пры гэтым ён упэўнены, што санкцыі — добры імпульс для айчыннай вытворчасці. Паводле яго слоў, каля 25 % медабсталявання — беларускай вытворчасці.

— Адна з сур'ёзных беларускіх фірм асвоіла выпуск КТ і МРТ. Ёсць заводы, якія актыўна ўключыліся ў імпартазамяшчэнне. У спісе — УГД, апаратура для фізіятэрапіі і іншае.

**Алена КРАВЕЦ.**

# НА «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ» — ДАДАТКОВЫ ЦЯГНІК

**Беларуская чыгунка на час правядзення XXXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску 2022» прызначыла цягнік міжрэгіянальных ліній № 644/643 Мінск — Віцебск. Пра гэта інфармуе прэс-цэнтр магістралі.**

Расклад руху цягніка складзены з улікам праграмы правядзення фестывалю. Ён будзе курсіраваць штодзень з Мінска з 13 да 18 ліпеня, з Віцебска — з 14 да 19 ліпеня.

Са станцыі Мінск-Пасажырскі цягнік адправіцца ў 12.28 і прыбудзе ў Віцебск у 16.05. Пасля завяршэння канцэртнай праграмы госці фестывалю на гэтым жа цягніку змогуць вярнуцца ў Мінск. З Віцебска ён будзе адпраўляцца ноччу ў 1.30 і прыбываць у сталіцу Беларусі раніцай у 5.40.

У дарозе з Мінска ў Віцебск пасажыры змогуць пазнаёміцца з гісторыяй фестывалю і праграмай яго правядзення сёлета. Таксама інтэр'ер вагонаў будзе афармлены з выкарыстаннем сімволікі форуму.

Акрамя таго, на чыгуначных вакзалах у Мінску і Віцебску пасажыраў праінфармуюць аб магчымасці праезду на фестываль «Славянскі базар у Віцебску» чыгуначным транспартам.

Цягнік на «Славянскі базар у Віцебску» традыцыйна карыстаецца асаблівай папулярнасцю ў жыхароў і гасцей краіны.

Продаж праязных дакументаў (білетаў) на цягнік міжрэгіянальных ліній № 644/643 Мінск — Віцебск ужо адкрыты.

# КІРОЎЦА ЗАБРАЎ ЗАБЫТЫ КЛІЕНТАМ КЛЮЧ І ВЫКРАЎ ЯГО АЎТО

**У міліцыю звярнуўся мінчанін, які расказаў, што ноччу знікла яго аўтамашына «Джылі Атлас», прыпаркаваная ў двары дома.**

Супрацоўнікамі міліцыі выкрадзены транспарт без слядоў узлому быў знойдзены за некалькі кварталаў ад месца крадзяжу. У ходзе разбору ўладальнік аўто ўспомніў, што ў канцы мінулага года вяртаўся з гасцей і па дарозе дадому страціў адзін камплект ключоў.

Аператыўнікі крымінальнага вышуку ГУУС сумесна з калегамі з Ленінскага РУУС па падазрэнні ў крадзяжы транспартнага сродку затрымалі 42-гадовага жыхара сталіцы. Мужчына, кіроўца таксі, адвозіў пацярпелага дадому і знайшоў у салоне згублены ім ключ.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, праз некаторы час затрыманы вырашыў скарыстацца знойдзеным ключом і ноччу выкраў машыну заяўніка. Праехаўшы некалькі кіламетраў і спалохаўшыся адказнасці, фігурант пакінуў аўто ў двары дома ў суседнім мікрараёне, зняўшы з яе рэгістрацыйныя знакі і схаваўшы ключ пад бампер.

У дачыненні да затрыманага распачата крымінальная справа за здзяйсненне крадзяжу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ШАГ: прафарыентацыя

# АБ АГРАГАЛІНЕ НА МОВЕ ШКОЛЬНІКАЎ

**З запатрабаванымі ў сельскай гаспадарцы прафесіямі, традыцыямі работы на роднай зямлі і аграрыямі, удастоенымі звання «Герой Беларусі», пазнаёміліся вучні Гомельскай сярэдняй школы № 32. Навучэнцаў 8—11 класаў запрасілі на дыялогавую пляцоўку «Гонар за Беларусь. Вырашчана беларусамі» ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа актыўнага грамадзяніна».**



Госцем сустрэчы стаў **супрацоўнік аднаго з вядучых будаўніча-рамонтных прадпрыемстваў краіны, старшыня прафсаюзнай арганізацыі ААТ «Хімрамонт» Сяргей ЗЮКІН.** Ён расказаў аб спецыфіцы работы таварыства, падраздзяленні якога будуюць «пад ключ» аб'екты — ад завадскіх цэхаў да птушнікаў. На прадпрыемстве, як адзначыў прафсаюзны лідар, рады кваліфікаваным маладым спецыялістам.

Вучні старэйшых класаў пацікавіліся, з дыпломам якіх навучальных устаноў можна працаўладкавацца ў «Хімрамонт», а таксама пацікавіліся і асабістым стаўленнем старшыні прафсаюзнай арганізацыі да выбару будучай прафесіі.

— Важна, упэўнены, выбраць прафесію даспадобы, тады і работа ў радасць, і твая праца карысная грамадству і дзяржаве, — падзяліўся Сяргей Зюкін.

У размове з навучэнцамі ён закрануў і тэму рэлакацыі маладых кваліфікаваных кадраў, калі супрацоўнік «мігрыруе» следам за сваёй кампаніяй за межы краіны.

— Працаваць на роднай зямлі, лічу, — сапраўды шчасце, — падкрэсліў старшыня прафкама будаўніча-рамонтнага прадпрыемства і прывёў прыклады, калі дасведчаныя спецыялісты ў чужой краіне становяцца нікому не патрэбныя, увогуле не могуць працаўладкавацца.

Каб больш падрабязна даведацца аб рабоце ААТ «Хімрамонт», педагогі і вучні звярнуліся з просьбай наведаць вытворчыя падраздзяленні прадпрыемства з экскурсіямі.

Удзельнік дыялогавай пляцоўкі «Гонар за Беларусь. Вырашчана беларусамі», настаўнік хіміі Гомельскай сярэдняй школы № 32 Настасся Зайцава пазнаёміла вучняў з асноўнымі напрамкамі развіцця айчыннай сельскай гаспадаркі. Педагог прапанавала з дапамогай інфармацыйных слайдаў разабрацца, як аграрная галіна стала найважнейшай часткай эканомікі краіны і якія вынікі развіцця галіны сельскай гаспадаркі былі дасягнуты за гады суверэнітэту Беларусі.

Аб знакамітых аграрыях, удастоеных звання «Герой Беларусі», школьнікам расказала настаўнік біялогіі Гомельскай сярэдняй школы № 32 Ала Сіманенка. Педагог звярнула ўвагу на тое, у якіх навучальных установах у краіне сёння рыхтуюць спецыялістаў сельскагаспадарчага профілю, расказала, дзе маюцца шырокія магчымасці для паступлення і чаму маладыя кваліфікаваныя кадры ў галіне сельскай гаспадаркі заўсёды запатрабаваныя на рынку працы.

Вучні гарадской школы ў сваім штодзённым асяроддзі пазбаўленыя прыкладаў працоўнай дзейнасці ў сельгасарганізацыях. Таму, як падкрэсліла **арганізатар дыялогавай пляцоўкі, намеснік дырэктара СШ № 32 горада Гомеля Наталля ШЧУРАВА,** асабліва важна тлумачыць дзецям, якую ролю ў эканоміцы нашай краіны адыгрывае сельская гаспадарка, якія формы стымулявання студэнтам прапануюць сельгасарганізацыі, каб зацікавіць маладых спецыялістаў.

— Сёння многія вучні выпускных класаў, — заўважыла Наталля Шчурава, — выказваюць зацікаўленасць у паступленні на спецыяльнасці сельскагаспадарчых профіляў. Шэраг нашых выпускнікоў 9 класаў у сёлетнюю ўступную кампанію будзе падаваць дакументы па паступленне ў Гомельскі дзяржаўны прафесійны аграрна-тэхнічны ліцэй. У школе мы таксама арганізавалі сустрэчу вучняў са студэнтамі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Яны вельмі падрабязна расказалі не толькі аб навучанні ў ВНУ, але і найцікавейшым грамадскім жыцці студэнтаў акадэміі. Для многіх нашых навучэнцаў гэта была сапраўды матывацыйная сустрэча, — падкрэсліла намеснік дырэктара.

Па выніках удзелу вучняў у дыялогавай пляцоўцы «Гонар за Беларусь. Вырашчана беларусамі» педагогі асабліва адзначылі водгук дзяцей на жывыя сустрэчы з дасведчанымі экспертамі і гасцямі.

— Увогуле ўсе мерапрыемствы праекта «Школа актыўнага грамадзяніна» дапамагаюць нам, настаўнікам, максімальна эфектыўна прапрацаваць з вучнямі самыя актуальныя ў грамадстве тэмы, арганізаваць цікавыя інфармацыйна-адукацыйныя сустрэчы, папулярныя сярод школьнікаў, — падзялілася Наталля Шчурава.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

### У тэму

Новыя падыходы ў фарміраванні матывацыі да паступлення выпускнікоў школ у ВНУ аграрнага профілю шукаюць на Гомельшчыне. **Старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО** ініцыіраваў правядзенне анлайн-сустрэчы будучых абітурыентаў з выкладчыкамі вядучых сельгасуніверсітэтаў краіны.

Па відэасувязі з райвыканкамаў у сустрэчы ўзяло ўдзел больш за 1130 выпускнікоў школ. Па відэаселектары з аблвыканкама да прысутных звярнуліся госці з Горак, Мінска, Гродна і Віцебска — прадстаўнікі чатырох ВНУ аграрна-тэхнічнага профілю.

— Праблема кадраў у аграпрамысловым комплексе мяне асабліва хвалюе, — падкрэсліў падчас анлайн-сустрэчы старшыня аблвыканкама Іван Крупко. — Сёння гэтая галіна рэгіёна ўкамплектавана на 92 %. Аднак забяспечанасць у заатэхніках і ветурачах складае 79 і 83 % адпаведна. Чым больш моладзі прыйдзе ў сельскую гаспадарку, тым хутчэй мы даб'ёмся прарыву ў галіне.

Кіраўнік рэгіёна звярнуў асаблівую ўвагу будучых абітурыентаў на эфектыўнае ўключэнне ва ўступную кампанію сельгасуніверсітэтаў. Акцэнт варта зрабіць на мэтавую падрыхтоўку навучэнцаў з заключэннем адпаведных дагавораў, выказаў упэўненасць губернатар.

— Перавагі мэтавай падрыхтоўкі відавочныя: ад выбару будучага месца работы і паступлення па асобным конкурсе да атрымання даплат ад арганізацыі, якая накіравала на навучанне. Вобласць штогод накіроўвае больш за 100 абітурыентаў для навучання ў аграрных ВНУ па мэтавых дагаворах. Такая форма сябе апраўдвае: найбольш паспяхова замацоўваюцца спецыялісты менавіта з ліку «мэтавікаў». Праз два гады на першым рабочым месцы працягваюць працаваць 63 % такіх спецыялістаў, — падкрэсліў старшыня Гомельскага аблвыканкама.

# У БЕЛАРУСЬ ПРЫБУДЗЕ ПЕРАСОЎНЫ МУЗЕЙ «ЦЯГНІК ПЕРАМОГІ»

**У нашай краіне гэты праект рэалізоўваецца па ініцыятыве Беларускай чыгункі сумесна з ААТ «Расійскія чыгункі» ў рамках Года гістарычнай памяці. Ён ажыццяўляецца пры падтрымцы Адміністрацыі Прэзідэнта і актыўным садзейнічанні Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра.**

Упершыню ў Беларусі «Цягнік Перамогі» пабываў у 2021 годзе. Тады ў васьмі гарадах яго экспазіцыю наведала больш за 25 тысяч жыхароў нашай краіны.

Па інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, у 2022 годзе ўнікальны перасоўны музей будзе курсіраваць па Беларускай чыгунцы з 10 чэрвеня да 4 ліпеня. Яго геаграфія істотна пашырана — перасоўны музей зробіць прыпынкі ў 17 гарадах: Оршы, Полацку, Віцебску, Крычаве, Жлобіне, Асіповічах, Баранавічах, Лунінцы, Пінску, Брэсце, Гродне, Калінкавічах, Гомелі, Магілёве, Бабруйску, Салігорску і Мінску.

Экспазіцыя пачне свой маршрут па Беларусі 10 чэрвеня з Оршы, дзе «Цягнік Перамогі» змогуць наведаць жыхары «ўсходняй брамы» нашай краіны. Графік руху цягніка складзены з улікам дзяржаўных свят і памятных дат. У Брэст «Цягнік Перамогі» прыбудзе 21 чэрвеня, напярэдадні Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. У Магілёве экспазіцыя будзе знаходзіцца 28 чэрвеня, у Дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А завершыцца тур па Беларусі ў Мінску падчас святкавання Дня Незалежнасці.

Наведвальнікаў перасоўнага музея чакае ўнікальнае падарожжа з поўным акунаннем у падзеі Вялікай Айчыннай вайны, што дасягаецца з дапамогай сучасных тэхналогій. У складзе «Цягніка Перамогі» дзевяць экспазіцыйных вагонаў, адзін з якіх прысвечаны подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці — удзельнікам гераічнай абароны, салдатам і камандзірам Чырвонай Арміі.

У аснове экспазіцыі — трохмерныя панарамы, макеты ў натуральную велічыню і шмат прадметнага плана на адлегласці выцягнутай рукі. Агляд «Цягніка Перамогі» задуманы як пераход ад аднаго эпізоду да іншага: перадваенныя гады — Вялікая Айчынная вайна — Перамога.

Экспазіцыя ўнікальная сваім мультымедыйным суправаджэннем: аб'ёмны гук, тэатральнае асвятленне, механічныя спецэфекты, датчыкі прысутнасці, галаграмы, панарамы баёў у віртуальнай рэальнасці, кіназдымка гістарычных рэканструкцый, трохмерная камп'ютарная графіка з мадэлямі ваеннай тэхнікі. Для кожнай зоны экспазіцыі спецыяльна напісана свая музыка.

Згодна з тэхналогіяй правядзення экскурсіі, у адным вагоне адначасова можа знаходзіцца не больш за дзесяць наведвальнікаў, час праслухоўвання аўдыягіда ў адным вагоне складае каля пяці хвілін, агульны час экскурсіі — 45 хвілін.

У сувязі з абмежаванай прапускной здольнасцю перасоўнага музея яго наведванне будзе ажыццяўляцца толькі арганізаванымі групамі жыхароў рэгіёнаў па запрашальных білетах, якія распаўсюджваюцца сярод арганізацый і навучальных устаноў краіны мясцовымі органамі выканаўчай улады.

Праект «Цягнік Перамогі» з'яўляецца сацыяльным як у Расійскай Федэрацыі, так і ў Беларусі. Час работы экспазіцыі — з 10.00 да 20.00, перапынак — з 14.00 да 15.00. Экспазіцыя рэкамендавана да наведвання дарослымі і дзецьмі, старэйшымі за 12 гадоў.

Акрамя таго, усе ахвотныя могуць здзейсніць віртуальны тур па экспазіцыі музея на сайце праекта «Цягнік Перамогі».

«Цягнік Перамогі» — маштабны гісторыка-асветніцкі праект, створаны ў Расійскай Федэрацыі камандай творчай майстэрні «Неўскі баталіст» сумесна з медыягрупай «Чырвоны квадрат» пры падтрымцы Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі Расійскай Федэрацыі, ААТ «Расійскія чыгункі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# Лета пачынаецца ў чэрвені

## Тэмпература на гэтым тыдні будзе вышэйшая за норму, але з дажджамі і навальніцамі

**Лета сёлета пачалося неяк нясмела, у першы тыдзень было нават халаднавата. Але цяпер яно бярэ сваё. Слупкі тэрмометраў з кожным днём усё вышэйшыя, а на змену плашчам і чаравікам прыйшлі басаножкі, лёгкія сукенкі і капелюшы. Чэрвеньскае сонца ўсяляк спрабуе кампенсаваць недахоп цяпла. Тэмпература вады ў рэках і вадаёмах працягвае павышацца, а гэта значыць, што купальны сезон не за гарамі.**



Тыдзень працягне радаваць жыхароў нашай краіны цяплом. Тэмпературны фон большасці дзён тыдня будзе вышэйшы за кліматычную норму, толькі да выхадных, пры зрушэнні франтальнага падзелу праз нашу тэрыторыю, тэмпература паветра ўвойдзе ў свае кліматычныя рамкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Паказчык таго, што да нас прыйшло сапраўднае лета, — цёплыя ночы. Яны будуць дастаткова цёплыя ўжо ў сераду. У гэтыя суткі ўначы будзе без істотных ападкаў, раніцай і ўдзень месцамі па паўночна-заходняй палове краіны кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Уначы паветра прагрэецца да плюс 10 — 17 градусаў, днём слупок тэрмометра дасягне 23—30 цяпла.

У чацвер будзе душна ўначы і горача днём. У гэты дзень месцамі па паўночна-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12—18 градусаў, удзень — 23—30 з плюсам. Па поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 32 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу месцамі, пераважна па паўночна-заходняй палове краіны, чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 13 да плюс 18 градусаў. Удзень слупок тэрмометра дасягне 24—30 цяпла, па паўднёвым усходзе — да 32 градусаў, а па крайнім захадзе будзе халаднавата — плюс 20—23 градусы. Да суботы тэмпература ўвойдзе ў нармальнае рэчышча ўначы, ды і днём будзе больш камфортна. Але ўначы месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 11—17 градусаў. Максімальная тэмпература ўдзень — плюс 19—26, а па паўднёвым усходзе — да 28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПРЫГАЖОСЦЬ, ШТО РАТУЕ НАСТРОЙ

## На ступенях «Садовага маркету»

Брэст адным з першых у краіне распрацаваў стратэгію азелянення і стаў увасабляць яе ў жыццё. Часткай яе і стаў названы конкурс. У другі яго дзень адбыўся вялікі кірмаш «Садовы маркет», які наведалі кіраўнікі горада і вобласці разам з удзельнікамі калегіі Міністэрства ЖКГ. На пляцоўцы «Зялёны востраў» размясціліся прадстаўнікі прадпрыемстваў сістэмы ЖКГ, прадпрымальнікі, якія прапануюць сваю прыгожую прадукцыю, іншыя зацікаўленыя вытворцы. Звярнуў на сябе ўвагу ўдзельнік кірмашу з Пінска Дзмітрый Паўлючык з прыгожымі плеценымі вербамі. Аўтару гэтых радкоў прадпрымальнік сказаў, што сваім зялёным бізнесам ён займаецца з 1998 года. За некалькі гадзін, нягледзячы на дождж, разабралі большую частку яго тавару. Яго арыгінальныя дрэвы ў кадушках, сплеценыя ў прыгожыя ўзоры ствапамі, выглядаюць сапраўднай экзотыкай, а растуць у нас. Іх яшчэ называюць паўночнымі пальмамі. Такая расліна, несумненна, упрыгожыць любую вуліцу, сквер альбо прыватны падворак.

Тут было шмат прадукцыі для сядзіб, клумб, градак. Працавала нават салдацкая кухня. Выступалі самадзейныя артысты, прыйшло шмат гасцей. Адкрываючы кірмаш «Садовы маркет», **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** сказаў, што мерапрыемства заклікана вывучыць найлепшы вопыт архітэктурных, творчых падыходаў да пытанняў добраўпарадкавання, азелянення вялікіх гарадоў, райцэнтраў, аграгарадкоў.

— Сёння мы наведалі некалькі пляцовак як узораў добраўпарадкавання, убачылі сапраўдныя астраўкі ўтульнасці, прыгажосці, камфорту. І ўпэўніліся: нішто так не ўзнімае настрой, як прыгажосць. Добра, што гэтую прыгажосць мы ствараем сваімі рукамі, — рэзюмаваў ён.



Дзмітрый ПАЎЛЮЧЫК і яго паўночныя пальмы.



Пляцоўка па вуліцы Гродзенскай.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Сквер і брэнд

**Міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ** паведаміў удзельнікам форуму цудоўную навіну. Сёлета Брэст прызнаны ў краіне лідарам па добраўпарадкаванні.

Конкурс працягваўся пяць дзён і стаў аглядам многіх добрых спраў па ўпрыгажэнні горада. Скажам, на вуліцы Гродзенскай з'явіўся арыгінальны сквер. А два гады таму, дарэчы, тут праходзілі грамадскія слуханні, і на гэтым месцы мог з'явіцца шматкватэрны дом. Але людзі выказалі іншую прапанову, і ўшчыльненне не адбылося. Сквер у густанаселеным раёне стаў сапраўдным аазісам паветра, а яшчэ прыгажосці. Гэты ўчастак добраўпарадкавалі, усталявалі дзіцячую пляцоўку. Ёсць і спартыўная. Да азелянення тэрыторыі падышлі творча: зялёныя астраўкі, каменьчыкі, драўляная шчапа — усё выглядае гарманічна. Цэнтрам гэтага міні-парку сталі тры вялікія ліхтары, якія адначасова выконваюць ролю арт-аб'екта і лавак для адпачынку. Бо на кожнай лаўцы можа адначасова размясціцца некалькі чалавек. Калі прыглядзецца, чытаюцца літары БЖС, гэта рускамоўная абрэвіятура КУП «Брэстжылбуда», які з'яўляецца аўтарам кампазіцыі. Забягаючы наперад, скажу, што па выніках конкурсу названае прадпрыемства атрымала Гран-пры менавіта за гэтую пляцоўку.

## Валуны і гістарычныя скульптуры

Парк валуноў таксама стаў падзеяй не толькі фестывалю, але і гарадскога жыцця. Гэты праект рэалізоўвалі прыкладна паўгода. Больш за сорак валуноў з Камянецкага і Пружанскага раёнаў даставілі на набярэжную Мухаўца ў раён Гарадскога саду. Аўтары канцэпцыі праекта — выкладчыкі брэсцкіх універсітэтаў Наталля Мартысюк і Максім Багдасараў (таксама прызёры конкурсу. — **Аўт**.) адзначалі падчас адкрыцця, што задаліся мэтай адлюстраваць сімволіку лясоў і палёў Беларусі, сведкамі якой з'яўляюцца гэтыя аграмадныя каменныя глыбы. Кампазіцыю дапоўнілі ствапамі сосен, якія пацярпелі ад караеда, што закрануў значную частку лясоў нашай краіны. І тут жа — маладыя парасткі дрэў як сімвалы паспяховага аднаўлення лясоў. Алеі новага парку валуноў выкладзены каменнымі бардзюрамі. Гісторыю кожнага з валуноў можна адсачыць з дапамогай QR-кодаў, якія ўстаноўлены тут. Такі вось сімбіёз: мінулага працягласцю ў мільёны гадоў і сучаснага.

Амаль кожная з пляцовак гэтага фестывалю засталася гараджанам на добры ўспамін і прыемны адпачынак. Так вынікам пленэра рэзчыкаў паркавай скульптуры «Візітоўкі гасціннага Бярэсця» стала цэлая галерэя скульптур, звязаных з гісторыяй горада. «Грэбень», «Купец», «Манетны двор», «Біблія», «Яўрэй і сінагога», «Грунвальд», «Сейм», «Магдэбургскае права», «Вакзал», «Мухавец і Буг» — назвы гавораць самі за сябе. А каля кожнай скульптуры цяпер устаноўлена лаўка, дзе можна ўтульна адпачыць.

## Конкурсы і знаходкі

| *Резерв на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам* Как раскрыто в Примечании 5.5 «Кредиты клиентам», валовая стоимость кредитов клиентам до вычета резерва по состоянию на 1 января 2022 года составила 3 150 817 тыс. руб., сумма созданного резерва на покрытие возможных убытков составила 239 665 тыс. руб. Группа формирует резервы на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам исходя из классификации кредитов по группам риска от I (самая низкая группа риска) до VI (самая высокая группа риска), применяя к ним соответствующий процент резервирования, который составляет от 0,5 % (I группа риска) до 100 % (VI группа риска). Вопрос формирования резервов является ключевым для нашего аудита в силу значительности сумм кредитов и резервов для консолидированной финансовой отчетности. Кроме этого, классификация по группам риска на основании анализа ряда финансовых и нефинансовых показателей, таких как оценка достаточности залогового обеспечения по кредитам, оценка признаков финансовой неустойчивости и наличия иной негативной информации о способности должника исполнить свои обязательства, требует применения Группой профессионального суждения при идентификации релевантной для принятия решения информации и ее интерпретации в контексте совокупности факторов, характеризующих способность должника исполнять свои обязательства. | В рамках проведенных аудиторских процедур мы получили понимание контрольных процедур в отношении процесса формирования резервов, в том числе автоматических контрольных процедур, касающихся алгоритмов отнесения кредитов, выданных клиентам, к группам риска и расчета резервов по каждой группе риска. Мы также провели выборочное тестирование эффективности автоматических контрольных процедур по расчету количества дней просрочки и ручных контрольных процедур в отношении оценки залогового обеспечения. Мы изучили методологию расчета резервов по кредитам клиентам на предмет ее соответствия требованиям законодательства и адекватности, включая критерии оценки финансового состояния заемщиков, выявления признаков негативной информации и оценку достаточности залогового обеспечения. Мы проанализировали на выборочной основе допущения, использованные при оценке финансового состояния отдельных заемщиков, наличия признаков негативной информации, достаточности залогового обеспечения, сверили указанные допущения с подтверждающими документами, когда применимо. На выборочной основе мы проверили корректность отнесения кредитов к соответствующим группам риска с учетом критериев, установленных законодательством и локальными нормативным и правовыми актами Группы, проверили правильность расчета суммы этих резервов. |

**Прочие вопросы**

Аудит годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка за год, закончившийся 31 декабря 2020 года, проводился другой аудиторской организацией, которая выразила в отношении данной отчетности немодифицированное мнение в аудиторском заключении от 13 мая 2021 года.

**Обязанности Группы по подготовке консолидированной финансовой отчетности**

Руководство Группы несет ответственность за подготовку и достоверное представление консолидированной финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля Банка, необходимой для подготовки консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке консолидированной финансовой отчетности руководство Группы несет ответственность за оценку способности Группы продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в консолидированной финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать Группу, прекратить ее деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки консолидированной отчетности Группы.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что консолидированная финансовая отчетность Группы не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

• выявляем и оцениваем риски существенного искажения консолидированной финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений консолидированной финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

• получаем понимание системы внутреннего контроля Группы, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

• оцениваем надлежащий характер применяемой Группой учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в финансовой отчетности;

• оцениваем правильность применения руководством Группы допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности Группы продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в консолидированной финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что Группа утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

• оцениваем общее представление консолидированной финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли консолидированная финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях;

• получаем достаточные надлежащие аудиторские доказательства, относящиеся к финансовой информации организаций или деятельности внутри Группы, чтобы выразить мнение о консолидированной финансовой отчетности. Мы отвечаем за руководство, контроль и проведение аудита Группы. Мы остаемся полностью ответственными за наше аудиторское мнение.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из тех вопросов, которые мы довели до сведения лиц, отвечающих за корпоративное управление, мы определяем вопросы, которые были наиболее значимыми для аудита консолидированной финансовой отчетности за текущий период и, следовательно, являются ключевыми вопросами аудита. Мы описываем эти вопросы в нашем аудиторском заключении, кроме случаев, когда публичное раскрытие информации об этих вопросах запрещено законом или нормативным актом или когда в крайне редких случаях мы приходим к выводу о том, что информация о каком-либо вопросе не должна быть сообщена в нашем заключении, так как можно обоснованно предположить, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят общественно значимую пользу от ее сообщения.

14 мая 2022 года

Руководитель задания — О.И. Степанеева
Квалификационный аттестат аудитора № 0001765 от 12 ноября 2009 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь
Свидетельство № 65 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 14 декабря 2011 года

Руководитель аудиторской группы — М.А. Шаченкова
Квалификационный аттестат аудитора № 0002335 от 23 декабря 2015 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь
Свидетельство № 94 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 21 января 2016 года

Получено: — В.В. Дедюль
Временно и. о. Председателя Правления «Приорбанк» ОАО

Наименование аудируемой организации: «Приорбанк» ОАО
Место нахождения: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31а
Сведения о государственной регистрации: решение Национального банка Республики Беларусь о государственной регистрации № 12 от 12 июля 1991 года
Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 100220190

Общество с ограниченной ответственностью «ДРТ Аудит»
Место нахождения: ул. К. Цеткин, 51а, 220004, г. Минск, Республика Беларусь
Сведения о государственной регистрации: Свидетельство о государственной регистрации, выданное Минским горисполкомом 21 апреля 2022 года № 0198149
УНП 101518377
Член Аудиторской палаты; регистрационный номер записи в реестре аудиторских организаций: 10045

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ

• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
**Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 61/1**

Здание конторы (350/С-161796, 629,1 кв. м).
***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу, общ. пл. **0,0614** га, на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания конторы (ограничения – водоохранная зона)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 144 596,06 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 2**
**Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53**

**1) Здание механизированной мойки,** инв. номер 350/С-163612, общ. пл. 127,3 кв. м. Составные части: кирпичная пристройка, смотровая яма, очистные сооружения
**2) КПП стоянки автотранспорта,** инв. номер 350/С-163639, общ. пл. 53,2 кв. м.
**3) Навес со смотровой ямой (мехмойка),** инв. номер 350/С-163641, 76 кв. м смот. яма.
**4) Очистные замазученных и ливневых вод,** инв. номер 350/С-170152. Составные части: закрытый горизонтальный отстойник.
**5) Дорожное покрытие,** инв. номер 350/С-170155.
**6) Забор,** инв. номер 350/С-170153, общ. пл. 386 м. Составные части: 4 ограждения, ворота.
**7) Тепловая сеть,** инв. номер 350/С-163618, протяж. 148,9 м. Составные части: каналы, 2 опоры, камера, колодец (1 шт.).
**8) Производственный водопровод,** инв. номер 350/С-163611, 213,3 м. Составные части: 2 трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.).
**9) Дождевая канализация,** инв. номер 350/С-163609, протяж. 234,3 м. Составные части: 4 трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприемник.
***Имущество, входящее в состав лота:*** **гидроциклон ГЦ- 15** (инв. № 3714), **устройства скребковые** (инв. №№ 3926, 3927)

***Сведения о земельном участке***: предоставлен Продавцу, общ. пл. **0,8989** га, на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения. Ограничения – водоохранная зона водных объектов

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 523 313,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 3**
**Месторасположение: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. Александровка**

**Адрес: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. 4а, 5, 7, 8, 9.**
**1) Цех СОУ (арочник),** 340/С-294759, общ. пл. 139,6 кв. м.
**2) Склад материалов,** 340/С-295182, общ. пл. 13,8 кв. м.
**3) Склад ГСМ,** 340/С-295183, общ. пл. 36,5 кв. м.
**4) Овощехранилище,** 340/С-294758, общ. пл. 77,3 кв. м.
**5) Столовая,** 340/С-290646, общ. пл. 146 кв. м.
**Адрес: Гомельская обл., Речицкий р-н, д. Александровка.**
**6) Гараж,** 340/С-290647, общ. пл. 792 кв. м.
**7) Здание конторы,** 340/С-290645, общ. пл. 241,1 кв. м.
Составные части и принадлежности: котельная, тамбур, сварочная.
***Имущество, входящее в состав лота:*** **забор металлический** (инв. № 200030), **станок СОУ-1** (инв. № 1782), **транспортер удаления отходов для станка СОУ** (инв. № 6707), **мачта осветительная** (инв. № 6709), **кран-балка с талью** (инв. № 6706)

***Сведения о земельных участках***, предоставленных Продавцу на праве постоянного пользования:
1) общ. пл. **4,6746** га, для размещения объектов недвижимости;
2) общ. пл. **2,9808** га, для содержания и обслуживания производственной базы;
3) общ. пл. **0,4706** га, для обслуживания гаража;
4) общ. пл. **0,2343** га, для обслуживания здания конторы.
Ограничения – прибрежная полоса водных объектов, охранные зоны линий электропередачи

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 190 758,14 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **60 (шестидесяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещении о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда от 08.04.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 22.06.2022 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.
Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 20.06.2022 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

**Антикризисный управляющий иностранного общества с ограниченной ответственностью «Арвибелагро» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 22.06.2022 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 третьих повторных открытых торгов по продаже дебиторской задолженности иностранного общества с ограниченной ответственностью «Арвибелагро»:**

ООО «Экофермер» (размер задолженности – 452 552,04 BYN) – первоначальная цена – 362 041,63 BYN;
ООО «БЕЛСКОР» (размер задолженности – 65,82 BYN) – первоначальная цена 52,66 BYN.

*Условия приема заявлений и прилагаемых к ним документов:* прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 21.06.2022.

*Сумма шага аукциона:* шаг аукциона (5 % от цены лота): 18 102,08 BYN – по лоту № 1; 2,63 BYN – по лоту № 2.

*Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним:* предмет торгов – дебиторская задолженность ИООО «Арвибелагро» – задолженность: ООО «Экофермер» (размер задолженности – 452 552,04 BYN); ООО «БЕЛСКОР» (размер задолженности – 65,82 BYN). Ознакомиться с документами можно по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5/221, предварительно согласовав с представителем управляющего по тел. 8 029 130 85 30.

*Сведения о продавце, его контактный телефон:* ИООО «Арвибелагро», тел. 8 029 130 85 30.

*Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактный телефон:* Антикризисный управляющий ИООО «Арвибелагро» – ООО «Капитал Диалог», г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221, 2-й этаж, тел. 8 029 130 85 30.

*Местонахождение предмета торгов:* г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221.

*Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего (расчетного) банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка:* задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота: 18 102,08 BYN – по лоту № 1; 2,63 BYN – по лоту № 2. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 21.06.2022 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 21.06.2022 г. на р/с ИООО «Арвибелагро» р/с BY06 BPSB 3012 1559 8601 1933 0000 (BYN) в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 590700407.

Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляются участником, выигравшим торги. Участие в торгах оформляется итоговым протоколом в день их проведения. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.




# ЗА ПАЎДНЯ Ў 30 КРАІНАХ

## Як зрабіць незвычайнае падарожжа ў Гродне

**«Ці далёка тут да Індыі? А да Арменіі і Грэцыі?» Карэспандэнту «Звязды» пашчасціла сустрэцца з прадстаўнікамі гэтых краін без кругасветнага падарожжа. Пры гэтым яшчэ і акунуцца ў іх культуру, традыцыі і пакаштаваць нацыянальныя стравы. І такіх шчаслівых — цэлы горад. На выхадных Гродна прымаў свой чарговы XIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур.**

У мяне ў руках карта-схема. На ёй нумары ад 1 да 18. Гэта галоўныя лакацыі фестывалю, якія атрымалі назву «Падворак» і сталі самымі папулярнымі для наведвальнікаў свята. На карце кожнаму нумару адпавядае падворак, дзе размясцілася адна альбо адразу некалькі этнічных суполак. Шукаць іх доўга не даводзіцца. Усе яны размешчаны літаральна ўздоўж адной вуліцы — Савецкай, адзінай пешай у горадзе, якая праходзіць праз гістарычны цэнтр. Тут, на адкрытых пляцоўках альбо ў старых дворыках, і чакалі гасцей прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў Беларусі.


Фота Віктара ДРАЧОВА.

Першы на маім шляху — падворак чувашоў. Заварочваем ва ўтульны дворык. Нас сустракае старажытнае свята Акатуй.

— Яно прысвечана земляробству, гэта «вяселле зямлі і плуга», — расказаў **старшыня міжнароднага грамадскага аб'яднання чувашоў Генадзь АЛЯКСАНДРАЎ** з Мінска. — Людзі радуюцца паспяховаму завяршэнню палявых работ.

Тут, у Гродне, чувашы пастаянныя ўдзельнікі свята. Для гасцей яны прыгатавалі свае нацыянальныя стравы. Каўбасныя дэлікатэсныя вырабы — шыртан, куплу — пірог з мясам і гароднінай. Імкненне да дастатку, прыбытку адлюстравана і ў самім адзенні. Яркія галаўныя ўборы ў жанчын з мноствам металічных кружкоў азначаюць манеты — сімвалы дабрабыту.

Працягваем наша падарожжа. І праз дзясяткі метраў, на пляцоўцы ўнівермага нас сустракае пранікнёная цыганская музыка, а яшчэ яркае афармленне ў выглядзе цыганскіх хустак і картаў. Мала хто праходзіць міма вядомага ў Гродне музычнага тэатра «Рада», таму прабіцца праз натоўп складана. Па словах аднаго з удзельнікаў, на фестывалі яны прадстаўляюць цыганскую праграму з 13 твораў. Высокае майстэрства нікога не пакінула абыякавым.

Трэба сказаць, што жыццё тут пачало віраваць ужо апоўдні. Увесь цэнтр горада запоўнены натоўпам, які рухаецца ад падворка да падворка. Адчуваецца, што атмасфера прасякнутая добразычлівасцю і вясёлым настроем. Людзі ахвотна дзеляцца ўражаннямі.

— Вельмі прыемна тут апынуцца зноў, праз такі, хоць і не вельмі працяглы, але перапынак, — дзеліцца Юрый Яцукевіч з Навагрудка. — Многія чакалі фестываль. Мы з жонкай прыехалі, каб зноў акунуцца ў яго цудоўную атмасферу. Мне падабаецца гасціннасць удзельнікаў. Знаёмства з нацыянальнай асаблівасцю розных народаў пашырае кругагляд, выклікае гонар за нашу шматнацыянальную культуру. Мяне вельмі ўразіў беларускі падворак.

Мы гутарым з Юрыем падчас шпацыру па вуліцы і сустракаем шыльду з цэлым шэрагам нацыянальных дыяспар. На адным падворку сышліся афганцы, іранцы, казахі, кітайцы, туркмены, узбекі. Прадстаўнікі афганскай абшчыны прыехалі ў Беларусь на вучобу і засталіся жыць у Мінску. Абодва жанатыя на беларусках. Кажуць, інтэрнацыянальныя сем'і для афганцаў — нярэдкая з'ява. Галоўнае, каб у сям'і былі згода і разуменне, а розная нацыянальнасць толькі ўзбагачае культуру, традыцыі, як і гэты фестываль, лічыць **старшыня грамадскай арганізацыі афганскіх бежанцаў Сайфурахман САФІ**. Зараз у афганскай дыяспары каля 670 чалавек.

Што датычыцца страў, якія прадстаўлены, — гэта ўсё ўсходняя кухня, кажуць мае суразмоўцы. І называюць галоўныя стравы: плоў, манты, самса.

Іду на гукі песні «Чырвона рута». Непадалёку на пляцоўцы размясціўся ўкраінскі падворак. Разам з выступленнямі аматарскіх спевакоў тут разгарнулася незвычайная выстава старадаўніх ручнікоў. Аказалася, гэта калекцыя жыхаркі Міншчыны Галіны Безбародзькі, заслужанага майстара Беларусі, якая 30 гадоў збірае ручнікі сваёй этнічнай радзімы. Некаторым па 100 і нават па 200 гадоў. Ёсць і аўтэнтычныя народныя касцюмы. «Тут, на фестывалі, — расказваюць Вера і Аляксандр Якавенкі, — толькі частка яе калекцыі, якая ўваходзіць у музейную экспазіцыю, што размешчана ў яе дома. Але яна з радасцю дала яе на гэты фестываль, у якім і сама неаднойчы прымала ўдзел».

Сярод асаблівасцяў украінскага падворка — фоталетапіс фестывалю, які знаёміць з гісторыяй форуму з пачатку яго заснавання. Украінцы — яго пастаянныя ўдзельнікі. І гэтым разам частавалі сваімі нацыянальнымі стравамі — пампушкамі, варэнікамі і пірагамі. Ну і, вядома, салам.






Якое свята без карагода! На рускім падворку артысты запрашалі ў круг усіх прысутных, і ніхто не застаўся ўбаку. Пазнаёміліся гродзенцы і госці горада з народнымі майстрамі, якія прадставілі свае вырабы з дрэва, саломкі, не абышлося і без традыцыйных матрошак. Таксама кожны мог уключыцца ў майстар-клас па іх роспісе. Ахвотных аказалася нямала.



— Фестываль — вялікае і вельмі сяброўскае свята, — лічыць **старшыня рэспубліканскага аб'яднання «Рускае грамадства» Сяргей МОЛАДАЎ**. — За гэтыя гады мы пасябравалі з усімі прадстаўнікамі нацыянальных суполак, ходзім у госці на падворкі. А паглядзець ёсць што, бо сюды з'язджаюцца найлепшыя творчыя калектывы з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Дынамічнай лезгінкай сустракалі выхадцы з Азербайджана, знакаміты сіртакі стаў лейтматывам грэчаскага падворка. Зачароўвалі сваёй магіяй індыйскія танцы, гучалі італьянскія песні...

На башкірскім дворыку сустрэлі гукі музыкі каля самай сапраўднай юрты. Падтрымаць сваіх землякоў у Беларусі прыехала дэлегацыя з Рэспублікі Башкартастан на чале з дэпутатам Дзяржаўнай думы, кіраўніком сусветнага аб'яднання башкіраў Эльвірай Айткулавай. Яна расказала, што гэту самую юрту прывезлі па даручэнні губернатара, а таксама нацыянальныя касцюмы, каб башкіры маглі прадэманстраваць усім свае традыцыі.

— Фестываль вельмі ўразіў, я ўпершыню прыехала ў Гродна, але адчуваецца, што ў свята ёсць гісторыя. Сапраўды, так гістарычна склалася: тут сышліся многія нацыянальнасці, культуры, рэлігіі. Мы гэта бачым на падворках. І горад вельмі зручны для такога свята, усё кампактна і разам з тым прасторна. Нам ёсць што пераймаць, — зазначыла прадстаўнік Башкартастана.

На польскім падворку абсталявалі «хатку» — са старадаўнім інтэр'ерам. Тут вучылі вырабляць кветкі з гафрыраванай паперы і ляпіць гліняныя гаршкі. А настрой стваралі мазурка, паланэз і кракавяк. Галоўнай стравай на польскім падворку сталі бігус, кішка, флякі, пончыкі.



— Мы вельмі рыхтаваліся, — расказаў **старшыня грамадскага аб'яднання «Саюз палякаў на Беларусі» Аляксандр САНГІН**. — Свята дае магчымасць прадэманстраваць сваю культуру, кухню. І разам з тым адчуць атмасферу сяброўства, аднадушша на беларускай зямлі, бо гэта наша радзіма і мы жывём і працуем дзеля гэтай краіны.

На літоўскім падворку мне ўручылі невялікі світак з добрымі пажаданнямі ў рыфмаванай форме. Як расказала **загадчыца Рымдзюнскага сельскага клуба Наталля БЯЛЯЧЫЦ**, на фестывалі прадстаўлена аматарскае аб'яднанне традыцыйнай народнай культуры «Жыльвідзіс» , што ў перакладзе азначае «вярба». У складзе дэлегацыі, якая прыехала з Астравецкага раёна, — як дзеці, так і сталыя жанчыны. Калектыў выконвае літоўскія і беларускія песні. Народныя майстрыхі арганізавалі выстаўку льняных ручнікоў і карункаў.

Многія наведвальнікі рабілі фота з гарманістам у нямецкім нацыянальным касцюме. Максім Марвельд прыехаў з Гомеля, а гармонік яму падарылі немцы. І хоць Максім сам баяніст, але асвоіў і гэты інструмент. Лічыць, што музыка і культура сапраўды аб'ядноўваюць людзей усіх нацыянальнасцяў.

Яўрэйская дыяспара прадставіла прадметы быту, якімі ў іх сем'ях карыстаюцца на працягу стагоддзяў. Гэта малітоўнік (сідур), мужчынскі галаўны ўбор (кіпа), чатырохвугольная накідка для малітвы (таліт) і многае іншае. Дарэчы, першыя яўрэйскія абшчыны з'явіліся ў канцы XIV стагоддзя ў Брэсце і Гродне.

— Для нас фестываль — доўгачаканая падзея, — падзяліўся **старшыня Савета Гродзенскага грамадскага аб'яднання яўрэйскай культуры Натан ШАМСУТДЗІНАЎ**. — Мы можам паказаць усю разнастайнасць нашых традыцый. Не толькі трагедыю Халакосту, але і тое, што яўрэйская абшчына працягвае жыць і развівацца.

Увогуле, кожны куток гістарычнага цэнтра Гродна быў прасякнуты каларытам розных культур і традыцый. Каля 800 прадстаўнікоў 30 нацыянальнасцяў знаёмілі наведвальнікаў фестывалю з культурнымі звычаямі, традыцыйнымі забавамі і старажытнымі рамёствамі свайго народа, а таксама частавалі стравамі нацыянальнай кухні.

Самым маштабным стаў беларускі падворак, які заняў усю плошчу. Рэспубліканскі фестываль сабраў тут прадстаўнікоў усіх абласцей краіны. Кожны рэгіён прадставіў сваё самае адметнае майстэрства, якое ўваходзіць у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Без перапынку гучалі песні творчых калектываў, а ветлівыя гаспадыні частавалі ўсіх прысутных канапэ і печывам. Як падсумавала прадстаўнік Магілёўскай вобласці Вольга Мядзведзева, фэст прынёс шмат радасных эмоцый, стаў крыніцай натхнення. Бо мір і згода — вельмі важныя каштоўнасці для кожнага чалавека і грамадства.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Спорт-тайм

# Прынцыпы перамогі павінны быць сумленнымі

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем актуальныя спартыўныя навіны

**ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ.** Беларуска Аліна Гарнасько стала пераможцай міжнароднага турніру па мастацкай гімнастыцы UAE Gymnastika Cup у Дубаі. У фінале мнагабор'я па суме чатырох практыкаванняў яна набрала 138,3 бала. Другое і трэцяе месцы занялі расіянкі Лала Крамарэнка і Дзіна Аверына. Таксама Аліна Гарнасько была найлепшай у практыкаваннях з мячом, булавамі і стужкай. У практыкаванні з абручом яна стала другой, а найлепшы вынік у гэтым відзе праграмы паказала наша Настасся Салас. Усяго ў спаборніцтвах прынялі ўдзел 19 дзяўчат з Беларусі, Расіі, ЗША, Венгрыі, Лівана і Казахстана.



**МЕДАЛІ ТЫДНЯ.** Беларускія спартсмены выступілі на 61-й Вялікай маскоўскай рэгаце. У першы дзень спаборніцтваў былі разыграны медалі ў паравеславанні. У класе лодак-адзіночак сярод жанчын найлепшай стала Людміла Волчак. Беларус Максім Мятлоў у мужчынскай адзіночцы заняў трэцяе месца.

Таксама на рахунку беларускай каманды дзевяць залатых, сем сярэбраных і пяць бронзавых узнагарод. Залатыя медалі турніру выйгралі Тацццяна Ганчарова (адзіночка лёгкай вагі), Філіп Павукоў (адзіночка), Дзмітрый Фурман і Сяргей Валадзько (двойка двухлопасцевая), Мікалай Шарлап і Яўген Залаты (двойка парная). «Серабро» дасталася Дзмітрыю Выберанцу і Арцёму Лапуту. Бронзавымі прызёрамі сталі Дар'я Новікава і Іна Нікуліна (двойка парная).

У спаборніцтвах сярод моладзі перамаглі Дар'я Вырупаева і Ганна Валаховіч (двойка парная), а таксама Дзяніс Клімята, Аляксандр Яскель, Аляксей Бандзюк і Антон Купалаў (чацвёрка двухлопасцевая). У гэтым жа відзе экіпаж Яўгена Лісоўскага, Міхаіла Копы, Мікіты Кнышава і Ільі Лабашынскага стаў другім. Таксама «серабро» заваявалі Іван Брынза і Ягор Шлюпскі (двойка парная). Уладзіслаў Лакун і Міхаіл Іванчыкаў атрымалі «бронзу» ў гэтай дысцыпліне. Трэція вынікі ў сваіх заездах паказалі Вераніка Гулевіч і Вольга Згурская (двойка двухлопасцевая), а таксама Алена Пімяненкава, Эвеліна Рымжа, Віялета Каратыш і Вераніка Анацка (чацвёрка двухлопасцевая).

У спаборніцтвах юніёраў залатыя ўзнагароды заваявалі Вікторыя Васільева (адзіночка), Кіра Каваленка і Мілана Дарахавец (двойка двухлопасцевая), Антон Бондар і Іван Макарэвіч (двойка парная). У гэтай жа дысцыпліне другімі сталі Максім Грыбоўскі і Іван Бубовіч, таксама «серабро» выйгралі Таццяна Пратасевіч і Анастасія Русак (двойка парная), Раман Шабацька (адзіночка) і Сцяпан Баўтрук, Цімур Драздоў, Мацвей Валаховіч і Уладзіслаў Матушэўскі (чацвёрка двухлопасцевая). «Бронза» на рахунку Лізаветы Скорабагатай, Хрысціны Епіхінай, Лізаветы Заборскай і Карыны Мінковай.

**НЯЎДАЧА ТЫДНЯ.** Футбалісты маладзёжнай зборнай Беларусі (U-21) пацярпелі пятае паражэнне ў адборачным турніры чэмпіянату Еўропы 2023 года. На гэты раз ад каманды Партугаліі. Вынік сустрэчы 1:5. Адзіны гол у складзе беларускай каманды забіў Ілья Васілевіч. Адборачны цыкл на кантынентальнае першынства беларускія футбалісты завершаць матчам з камандай Ісландыі 8 чэрвеня.

**ЦЫТАТА ТЫДНЯ.** «Днямі мы зрабілі некалькі важных падпісанняў маладых хакеістаў. Рады, што ў камандзе засталіся Віталь Пінчук і Сяргей Кузняцоў. У мінулым сезоне яны не так шмат згулялі ў КХЛ, але затым выдатна праявілі сябе ў плэй-оф экстралігі, стаўшы лідарамі «Металурга». Чакаем, што ў новым сезоне яны зробяць якасны рывок. Таксама павышаць планку павінны Дзмітрый Дзярабін і Ігар Мартынаў, на лідарскія ролі могуць выйсці Дзмітрый Буйніцкі і Уладзімір Алістраў. Тое ж самае скажу пра Паўла Варфаламеева, які валодае высокім выканальніцкім майстэрствам», — адзначыў гендырэктар хакейнага клуба «Дынама-Мінск» наконт бягучай селекцыйнай кампаніі. Яго словы прыводзіць прэс-служба клуба. Па словах Сяргея Сушко, маладыя навічкі клуба Валянцін Дземчанка і Вадзім Мароз — цікавыя форварды, якія павінны абвастрыць канкурэнцыю. Па словах гендырэктара «зуброў», у найбліжэйшы час клуб пачне падпісваць легіянераў. «Кожны замежны хакеіст павінен быць і моцным гульцом, і добрым прыкладам для маладых гульцоў як на пляцоўцы, так і ў побыце», — сказаў Сяргей Сушко.

**ПАДЗЕЯ ТЫДНЯ.** Беларусы прынялі ўдзел у міжнародным форуме юных алімпійцаў, які прайшоў у Маскве. У складзе беларускай каманды — 60 юных атлетаў з 22 відаў спорту. Падчас форуму яны пазнаёміліся з перадавымі напрацоўкамі ў галіне фізічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі, псіхалогіі, рэабілітацыі пасля траўм, а таксама антыдопінгавых праграм. Разам з юнымі атлетамі ў форуме ў якасці гасцей удзельнічалі і вопытныя спартсмены: алімпійская чэмпіёнка Ала Цупер, чэмпіёнка свету па біятлоне Алена Зубрылава, прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы па мастацкай гімнастыцы Кацярына Галкіна.



«Калі цяжка, мы павінны адно аднаму падставіць плячо, быць салідарнымі, даказваць усяму свету, што нашы каштоўнасці — гэта каштоўнасці дружбы, павага да сваёй гісторыі. Прынцыпы перамогі павінны быць сумленнымі. Упэўнены, што наша адзіная міжнародная каманда пераадолее ўсе складанасці», — сказаў на адкрыцці форуму міністр спорту Расіі Алег Матыцын.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 7 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

**1932** год — нарадзіўся Міхаіл Навумавіч Герчык, беларускі пісьменнік. Аўтар раманаў «...Аддаеш назаўжды», «Здабыццё надзеі», дакументальнай аповесці «Час гаспадароў» і інш. Юным чытачам адрасаваў аповесці «Ляці, Ікар!», «Вецер ірве павуціннe» і шматлікія апавяданні.

**1937** год — нарадзіўся Пётр Фролавіч Дзмітрачкоў, беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Аўтар даследаванняў па праблемах узнікнення і развіцця дзяржаўнасці ў Беларусі, этнагенезу беларусаў, гісторыі ВКЛ.



У свеце

**1872** год — нарадзіўся Леанід Вітальевіч Собінаў, рускі спявак, народны артыст РСФСР. Адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў рускай вакальнай школы. У 1897—1933 гг. спяваў у Вялікім тэатры.

**1897** год — нарадзіўся Кірыл Апанасавіч Мерацкоў, савецкі ваеначальнік, Герой Савецкага Саюза, Маршал Савецкага Саюза. Удастоены найвышэйшага ваеннага ордэна «Перамога».

**1902** год — нарадзіўся Жорж Ван Парыс, французскі кампазітар.

**1907** год — нарадзілася Валерыя Аляксееўна Дзяменцьева, расійская актрыса, артыстка МХАТа (з 1936 г.), народная артыстка РСФСР.

**1912** год — нарадзіўся Яўген Васільевіч Батурын, савецкі і ўкраінскі акцёр тэатра і кіно, рэжысёр. Быў акцёрам Дзяржаўнага рускага тэатра імя М. Горкага, рэжысёрам Гродзенскага, Брэсцкага і Гомельскага абласных драматычных тэатраў.

**1952** год — нарадзіўся Архан Памук, турэцкі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (2006).

У гэты ж дзень нарадзілася Дар'я Данцова (сапр. Агрыпіна Аркадзьеўна Данцова), расійская пісьменніца, аўтар папулярных іранічных дэтэктываў.

**1957** год — нарадзіўся Уладзімір Аляксандравіч Сіманаў, расійскі акцёр, артыст Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Яўгена Вахтангава, народны артыст Расійскай Федэрацыі.

Так гаварыў...

**ВАСІЛЬ БЫКАЎ:**

*«Вайна на дзіва сляпая ў адносінах да людзей і далёка не па іхніх заслугах распараджаецца жыццямі».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.37 | 16.57 |
| Віцебск — | 4.22 | 21.35 | 17.13 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.28 | 16.58 |
| Гомель — | 4.36 | 21.15 | 16.39 |
| Гродна — | 4.57 | 21.51 | 16.54 |
| Брэст — | 5.07 | 21.42 | 16.35 |

### Месяц

***Першая квадра ў 17.48.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

### Імяніны

***Пр.*** *Івана, Ферапонта.*
***К.*** *Яўгеніі, Адрыяна, Антонія, Густава, Роберта, Яраслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

**Я адкрыла ў сабе жанчыну. Падкажыце, як закрыць яе назад, у мяне няма столькі грошай!**

Жанчынам кар'ера даецца цяжэй, бо ў іх няма жонкі, якая штурхала б іх наперад.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1492.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 6 чэрвеня 2022 года.